прадметы, з'явы, падзеі; звесткі пра гістарычных асоб, дзеячаў навукі, культуры, асобныя гарады і краіны, іх прыродныя багацці і выдатныя мясціны. Слоўнікавыя артыкулы ў слоўніках такога тыпу не даюць граматычнай і стылістычнай характарыстык, а таксама тэрміналагічных і фразеалагічных спалучэнняў. Указваецца толькі паходжанне запазычанных тэрмінаў і пазначана месца націску на загаловачных словах (назоўнікі або спалучэнні назоўнікаў з прыметнікамі і лічэбнікамі). Ілюстрацыямі ў слоўніках гэтага тыпу служаць, малюнкі, табліцы, рэпрадукцыі, карты, схемы, фотаздымкі.

Паводле характару інфармацыі слоўнікі падзяляюцца на ўніверсальныя, галіновыя, спецыяльныя і рэгіянальныя.

Да энцыклапедычных выданняў адносіцца "Беларуская Савецкая энцыклапедыя" ў 12-ці тамах (1969-1975) і іншыя. Выдадзены персанальныя энцыклапедыі "Янка Купала" (1986) і "Францыск Скарына і яго час" (1988).

Лінгвістычныя слоўнікі апісваюць словы – іх значэнне, ужыванне, паходжанне, марфемную будову, вымаўленне, напісанне. Слоўнікавыя артыкулы змяшчаюць сэнсавую, граматычную, стылістычную, этымалагічную характарыстыкі, пераклад на іншую мову, ілюстрацыйны матэрыял, тэрміналагічныя і фразеалагічныя спалучэнні. Ілюстрацыямі ў большасці лінгвістычных слоўнікаў з'яўляюцца прыклады ўжывання слоў у сказах, што бяруцца з літаратурных крыніц.

Падзяляюцца ўсе слоўнікі на тры асноўныя віды: аднамоўныя двухмоўныя і шматмоўныя. Таксама слоўнікі бываюць: тлумачальныя, дыялектныя, гістарычныя, этымалагічныя, арфаграфічныя, фразеалагічныя, слоўнікі мовы пісьменніка, марфемныя, анамастычныя, іншамоўных слоў, сінонімаў, амонімаў, паронімаў, эпітэтаў, частотны, асацыятыўныя, тэрміналагічныя.

Характарыстыка слоўнікаў беларускай мовы розных тыпаў сведчыць, што беларуская лексікаграфія і тэрмінаграфія як асобныя раздзелы навукі аб мове атрымалі належнае развіццё. Слоўнікі патрэбныя чалавеку, каб мець уяўленне аб розных значэннях канкрэтных слоў, апісання тэрмінаў, паглыблення ведаў у пэўнай галіне, пашырэння слоўнікавага запасу.

# РАЗВІЦЦЁ БАТЛЕЙКІ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ


УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»

**Салянская Я.М., студэнтка 2 курса медыка-дыягнастычнага факультэта**

Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук

Навуковы кіраунік – к. гіст. н., дацэнт Стасевіч М.П.


Батлейка – беларускі народны тэатр лялек, безомоуна, зяўляецца прыкметай нацыянальнай свядомасці беларусаў. Існаванне батлейкі на Беларусі пацвярджаецца дакументамі XVI стагоддзя. Узнікненне батлейкі звязана з калянднымі святамі (адгэтуль назва Віфлеем – месца нараджэння Хрыста). Спачатку батлейка наладжвалася з Раства Хрыстова да Хрышчэння (на

Рэпазіторый ГрДМУ

Каляды), пасля – да Грамніц. Затым дзейнасць пашырылася і на іншыя святы, асабліва кірмашовыя.

У прадстаўленнях, прымеркаваных да калядных свят, паказваліся біблейскія сцэны нараджэння Хрыста, пакланення яму пастухоў і каралёў-вешчуноў, праследу жорсткім царом Ірадам нявінных немаўлятак. Адраджэнне батлейкі адбывалася ў перыяд росту нацыянальнай самасвядомасці ў пачатку ХХ стагоддзя. На пачатку ХХ стагоддзя спектаклі ладзілі толькі асобныя батлеяры. Захаваліся ўспаміны пра дзейнасць аднаго з такіх – батлейніка Патупчыка, які выступаў у Докшыцах з 1909 па 1916. Вядомы таксама мірскія батлеяры Яўген Сілко з братам [1], Мацей Барашка з сынам, Ёсіф Моніч, што ставіў батлейку на Наваградчыне да 1939 года [2]. На іх і абарвалася жывая батлейкавая традыцыя. Але некаторыя тэатральныя трупы вандравалі зрэдку па Беларусі.

Распаўсюджанню батлеечнага тэатра на Гродзеншчыне спрыяе вялікая колькасць каталіцкіх і праваслаўных храмаў, пры якіх штогод ладзяцца калядныя батлейкі.

Гродзенскі францысканскі касцёл – адзіны каталіцкі храм, дзе традыцыйная калядная батлейка ажыла. Батлейку зрабіў ксёндз Аркадзь Вальтась, які пасля вайны прыслужваў у францысканскім касцёле ў Гродне. “Першапачаткова кожная фігурка, акрамя таго, што круцілася па коле вакол ясляў Езуса, рухалася сама па сабе, – расказаў настаяцель прыхода айцоў францысканцаў Юзэф Макарчык. – Адзін музыка граў на баяне, другі – на скрыпцы, кабета гушкала дзіця на руках, а анёл звінеў званочкам. Кола круціцца, чапае дротам фігурку, і гэта фігурка варушыцца. І гэта важна, што яна жывая. Такім спосабам яна ажывае”.

Незвычайная батлейка, якая з’явілася ў парафіі Найсвяцейшага Адкупіцеля ў Гродне, прыцягвае ўвагу не толькі парафіян, але і шматлікіх жыхароў горада. Рухомыя фігуркі батлейкі, якія кланяюцца, танчаць, становяцца на калені, выклікаюць вялікую цікавасць не толькі ў дзяцей, але і ў дарослых.

Гэткая батлейка – выдатны прыклад сімбіёзу традыцыйнай біблейскай і сучаснай культур. Зрабіў яе 85-гадовы айцец Казімір. Сем гадоў таму ён адмыслова прыехаў у Гродна і цягам месяца ўсталёўваў калядную шопку. Мясцовыя святары дадалі шопцы беларускія народныя матывы і разбавілі дзіцячымі цацкамі. Акрамя Божага Нараджэння, у ёй паказаны іншыя біблейскія сцэны, такія як Вавілонская вежа, Адам і Ева ў райскім садзе, цар Ірад. Шопку ўпрыгожваюць дзясяткі розных лялек, ёсць беларускія і польскія, ёсць дзіцячыя забаўкі, самалёцікі, карабельчыкі і машынкі, а ёсць лялькі, выкананыя з гіпсу, з якога робяць зубы. На дадатак шопку можна пабачыць круглы год.

Лялечны тэатр “Лямцавая батлейка” ў 2013 годзе прадстаўляў спектакль “Мама Му чытае і прыбірае”. Спектакль быў цікавы дзеткам дашкольнага, малодшага школьнага ўзросту і дарослым, якія не страцілі адчування дзяцінства.



Репозиторий ГрГМУ

Пачуць падрабязную гісторыю батлейкі можна ў Гродзенскім музеі гісторыі рэлігіі. Тут ёсць дзве батлейкі. Адну ў пачатку 90-х гадоў зрабіў з саломкі аўтар з Вілейшчыны, другую – рэстаўратар музея Уладзімір Кіслы. Выстава батлеек «Цуд у Віфлеемскую ноч» праходзіла ў 2012 годзе, была прысвечана гісторыі батлеечных тэатраў у Беларусі, а таксама каталіцкай традыцыі пабудовы калядных ясляў. На ёй былі прадстаўлены батлейкі, выкананыя ў розных тэхніках у гэтым і мінулым стагоддзі, а таксама рэканструкцыі народных батлеек XVIII-XIX стагоддзяў.

Вучнямі гарадзенскай іканапіснай студыі «Пакроў» была створана батлейка, якая штогод упрыгожвае ўваход у Свята-Пакроўскі кафедральны сабор.

Батлейка пры Свята-Уладзіміраўскай царкве ў Гродне паказвае спектаклі маральнай тэматыкі. Рухаюцца лялькі дзякуючы моладзі з праваслаўнага брацтва, што пры царкве.

Рэпертуар батлейкі на сучасным этапе звузіўся. Сучасны глядач у параўнанні з мінулым значна памаладзеў. Калі ў папярэднія стагоддзі на прадстаўленне збіраліся ўсе жыхары, незалежна ад узросту, то на сучасным этапе сярэдні ўзрост гледача – ад 3 да 13 гадоў. Па сваёй будове батлейкі істотна не змяніліся. Ёсць аднапавярховыя з нерухомымі лялькамі. Яны ў асноўным прадстаўлены ў праваслаўных і каталіцкіх храмах. Ёсць двухпавярховыя, іх выкарыстоўваюць аматарскія калектывы. Але сустракаюцца дзіўныя батлейкі, якія не адпавядаюць традыцыям папярэдніх стагоддзяў.

Раней адзін чалавек быў і рэжысёрам, і драматургам, і мастаком, і музыкантам, і таленавітым акцёрам-самародкам. Магла быць цэлая сям'я. На сучасным этапе батлейку стварае калектыў аднадумцаў.

ЛІТАРАТУРА:

1. Пашкоў, Г. П. Батлейка: Тэатральная Беларусь / Г. П. Пашкоў // Энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2002. – Т. 1.
2. Барышаў, Г. І. Беларускі народны тэатр батлейка / Г. І. Барышаў, А. К. Саннікаў.– Мінск, 1962.

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»
**Сарокіна К.А. студэнтка 1 курса факультэт права**
Кафедра беларускай і рускай моў
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Наталевіч В.Г.

Сёння беларуская мова – гэта поліфункцыянальная мова, якая можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства. У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (артыкул 17) афіцыйна замацаваны дзве

Рэпазіторый ГрДМУ